ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Гомельскі ўніверсітэт

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМІТЭТА ЛКСМБ
І ПРАФКОМАЎ ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА

№ 18 (578) | Субота, 2 чэрвеня 1984 г. | Газета заснавана ў верасні 1969 года. Выходзіць раз у тыдзень | Цана 2 кап.

*Харчовая праграма — справа кожнага*

## ПРАЦАВАЛІ ДРУЖНА

У падшэфным саўгасе «Усход» Лоеўскага раёна адпрацаваў другі заезд выкладчыкаў і супрацоўнікаў нашага універсітэта. **У сваіх радах ён** налічваў 67 чалавек. Большасць з іх праявілі высокую свядомасць і прадэманстравалі **ўзоры стараннасці на пасадцы** расады памідораў і капусты. За тыдзень на трынаццаці гектарах было запраўлена ў глебу 600 тыс. каліў раслін.

Праўда, у першыя дні мелі месца перабоі з дастаўкай на поле пасадачнага матэрыялу. **Таму мы сфарміравалі з дзесяці чалавек брыгаду, якая за**бяспечыла бесперабойную дастаўку расады не толькі для нашай брыгады, але і для іншых работнікаў. У гэтым вялікая заслуга дацэнта кафедры палітэканоміі У. С. Дайнекі, загадчыка кафедры англійскай мовы дацэнта І. М. Акулава, загадчыцы бібліятэкі В. М. Касцючэнкавай. Яны вя**лі таксама строгі ўлік работы,** выкананай кожным членам брыгады.

На пасадцы расады вызначыліся супрацоўнікі лабараторыі сістэмнага праграміравання М. Б. Шур і аддзела навукова-тэхнічнай інфармацыі А. М. Свярдлова, асістэнт ка**федры АМАЭІ Н. В. Жыгалі**на, а таксама М. М. Сярдзюк, і У. М. Шырукаў з геалагічнага, Т. Г. Вінічэнка і С. Ф. Захарава з матэматычнага факультэтаў, супрацоўнікі універсітэта Т. А. Хахлова, М. Ф. Ярмалкевіч, камісар атрада У. А. Чмых, Т. А. Скрыні**чэнка, В. Е. Громава і іншыя.**

Прадукцыйная праца немагчыма без каларыйнай і смачнай стравы. З першага і да апошняга дня яе дапамагалі рыхтаваць шэф-повару жанчыны атрада. Кулінарныя задаткі праявіла В. І. Андрэйчыкава з фістфіла.

**Ад паспяхова выкананага вы**творчага задання ў членаў брыгады засталося пачуццё вялікага задавальнення. Больш 250 рублёў, якія нам належыла атрымаць па заканчэнню працы, было аднадушна вырашана пералічыць у Савецкі фонд міру.

**В. КАЎДЭРКА,**
**камандзір атрада ГДУ другога заезда.**

*Інфармацыйна-прапагандысцкая група — студэнтам*

## ПА ХВАЛЮЮЧЫХ ПЫТАННЯХ

Традыцыйны «Дзень адкрытага пісьма» праведзены ў мінулы аўторак у Доме палітычнай асветы Гомельскага абкома КПБ. На сустрэчу з інфармацыйна-прапагандысцкай групай гаркома партыі і гарвыканкома сабралася студэнцкая моладзь, выкладчыкі і супрацоўнікі ВНУ горада — ГДУ, БІІЧТу, політэхнічнага і кааператыўнага інстытутаў, каб атрымаць адказы на хвалюючыя іх пытанні.

У прэзідыуме — першы сакратар гарадскога камітэта КПБ В. А. Санчукоўскі, сакратар гаркома партыі Н. Ф. Іванова, першы намеснік старшыні гарвыканкома М. І. Скрыннікаў, іншыя адказныя работнікі, рэктары, прарэктары, сакратары парткомаў ВНУ.

Сустрэчу адкрыў першы сакратар гаркома партыі В. А. Санчукоўскі. Ён расказаў аб сённяшнім дні абласнога цэнтра, перспектывах яго развіцця ў наступнай пяцігодцы, адзначыў, што ў ажыццяўленні грандыёзных планаў будуць прымаць удзел і сённяшнія студэнты, будучыя маладыя спецыялісты.

19 тысяч юнакоў і дзяўчат набываюць сёння веды ў чатырох вышэйшых навучальных установах г. Гомеля, рыхтуюць сябе да свядомай і творчай працы на карысць грамадства. Многія з іх — актыўныя ўдзельнікі навукова-даследчай работы, а таксама патрыятычнага руху моладзі — студэнцкіх будаўнічых атрадаў. Вялікі ўклад студэнцтва горада — удзельнікаў СБА ў выкананне народнагаспадарчых задач. Імі асвоена звыш 7 мільёнаў рублёў капітальных укладанняў.

Шмат пытанняў было зададзена студэнтамі на сустрэчы. Іх цікавілі перспектывы будаўніцтва інтэрната для студэнцкіх сем'яў, змена распарадку работы бібліятэк горада, забеспячэнне спартсменаў спартыўнай формай, умовы і льготы студэнтам, якіх прызываюць на службу ў рады Савецкай Арміі, паляпшэнне харчавання ў сталовых і буфетах навучальных устаноў. Адказы на гэтыя пытанні ім далі першы намеснік старшыні гарвыканкома М. І. Скрыннікаў, намеснік старшыні гарадскога выканаўчага камітэта С. Л. Радзіён, намеснік ваеннага камісара г. Гомеля У. А. Шастакоў.

На пытанні аб паляпшэнні работы гарадскога транспарту, павышэнні якасці прадукцыі прамысловых прадпрыемстваў г. Гомеля, перспектывах развіцця гандлёвай сеткі, навядзенні належнага парадку ў месцах культурнага адпачынку гамяльчан вычарпальныя адказы далі намеснік старшыні гарвыканкома Д. В. Праведны, загадчык аддзела гандлю гарвыканкома У. Р. Мазгавы, нам. начальніка абласнога ўпраўлення ўнутраных спраў П. М. Заркевіч.

Ва ўмовах развязвання супраць нас «псіхалагічнай вайны», крыжовага паходу капіталізму супраць сацыялізму студэнцкая моладзь не можа заставацца ў баку ад агульнай барацьбы за мір. Таму не выпадкова на сустрэчы імі было зададзена нямала пытанняў і на міжнародныя тэмы. На іх адказаў лектар-міжнароднік В. В. Крывіч.

**Т. ДУБЯК.**

## УРУЧАНЫ НОВЫЯ ПРАФСАЮЗНЫЯ БІЛЕТЫ

У панядзелак ва універсітэце пачалося ўручэнне прафсаюзных білетаў новага ўзору. Першымі ва ўрачыстай абстаноўцы іх атрымалі рэктар ГДУ акадэмік АН БССР Б. В. Бокуць, прафсаюзны стаж якога пачынаўся з 1947 года, загадчык кафедры батанікі і фізіялогіі раслін прафесар Ф. М. Харытановіч, які састаіць у радах прафсаюзнай арганізацыі звыш 60 гадоў, загадчык кафедры вылічальных машын і праграміравання прафесар В. П. Рубанік, член прафсаюза з 1936 года, прарэктар па вучэбнай рабоце член-карэспандэнт АН БССР Л. А. Шамяткоў, прарэктар па АГР У. А. Шаўчэнка. Новыя білеты былі ўручаны таксама дэканам факультэтаў, загадчыкам кафедр, прафсаюзным актывістам. Іх уручыў старшыня абкома прафсаюза работнікаў асветы, вышэйшай школы і навучальных устаноў У. Я. Курылаў.

На прайшоўшым тыдні новыя прафсаюзныя білеты атрымалі выкладчыкі і супрацоўнікі матэматычнага і геалагічнага факультэтаў, члены прафсаюза іншых падраздзяленняў універсітэта.

**М. МУРАШКА,**
**старшыня прафкома ГДУ.**

*З агульнаўніверсітэцкага партыйнага сходу*

## МІНУСЫ ПЕРАТВАРЫЦЬ У ПЛЮСЫ

Як паведамлялася ў нашай газеце, 25 мая ў актавай зале адбыўся адкрыты агульнаўніверсітэцкі партыйны сход па пытанню «Аб рабоце партыйнага бюро і дэканата біялагічнага факультэта па ўдасканальванню вучэбна-выхаваўча**га працэсу і павышэнню эфек**тыўнасці навуковых даследаванняў». З дакладам выступіў дэкан біяфака дацэнт **С. Ф. Алешка.**

Партыйная арганізацыя, дэканат, кафедры, прафсаюзная і камсамольская арганізацыі біялагічнага факультэта ў сваёй дзейнасці кіруюцца рашэн**нямі XXVI з'езда КПСС, XXIX з'езда КПБ, наступных Пленумаў ЦК КПСС, пастановамі** партыі і ўрада, ўказаннямі міністэрстваў вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі СССР і БССР аб удасканальванні работы вышэйшай школы. Агульнымі намаганнямі за апошнія гады зроблена многае па павышэнню вучэбна-выхаваўчай і навукова-метадычнай работы і павышэнню эфектыў**насці навуковых даследаванняў. Факультэт мае высокі** навуковы патэнцыял. На яго кафедрах **працуюць 2 доктары** і 13 кандыдатаў навук. Колькасць выкладчыкаў з вучонымі ступенямі і званнямі перавышае палавіну ўсяго саставу. Гэта дазваляе весці навучанне і выхаванне студэнтаў на дастаткова высокім ідэйна-палітычным узроўні. Факультэт на працягу апошніх гадоў па выніках паспяховасці будучых біёлагаў займае вядучыя ступенькі. Пераважная большасць дыпломных работ выконваецца па выніках навуковых даследаванняў на высокім тэарэтычным узроўні. Лепшыя з гэтых работ рэкамендуюцца **ДЭК** да ўкаранення.

На факультэце пастаянна клапоцяцца аб выданні вучэбна-метадычных дапаможнікаў для студэнтаў дзённай і завочнай формы навучання. **Тут** паспяхова працуе семінар і праводзяцца канферэнцыі па ме**тадалагічных праблемах** сучаснай біялогіі і хіміі, універсітэт маральна-эстэтычнага выхавання. Пры высокай актыўнасці ўдзельнікаў праводзяцца канферэнцыі па выніках навуковай работы прафесарска-выкладчыцкага саставу і студэнтаў. Дзейнасць партбюро, дэканата і грамадскіх арганізацый факультэта накіравана таксама на ўдасканальванне праграм вучэбнай і вытворчай практык. Вялікая ўвага ўдзяляецца ўкараненню новых форм і метадаў правядзення грамадска-палітычнай практыкі студэнтаў. Гэта пытанне неаднаразова абмяркоўвалася на пасяджэннях партбюро, партыйных сходах, на саветах куратараў. За перыяд навучання студэнты факультэта, як правіла, па два-тры разы ўдзельнічаюць у працоўных семестрах СБА.

Ёсць пэўныя поспехі такса**ма ў канцэнтрацыі і каардынацыі навуковых даследаванняў**, ва ўкараненні ў вытворчасць і павышэнні эфектыўнасці іх вынікаў.

Адначасова як у дакладзе, **так і ў выступленнях**, гаварылася аб істотных недахопах, якія мелі месца ў рабоце партбюро, дэканата і кафедр біяфака. Тут яшчэ параўнаўча высокі працэнт здавальняючых адзнак. І ніжэй жадаемага — выдатных. Назіраюцца выпадкі пропуску студэнтамі лекцыйных, семінарскіх і прак**тычных заняткаў без уважлі**вых прычын. Куратары і камсамольскія групы не дабіліся актыўнага ўдзелу ў грамадскай рабоце ўсіх студэнтаў. Не на належным узроўні вядзецца **выхаваўчы працэс. Партыйнай і камсамольскай арганізацыям і дэканату факультэта** неабходна больш плённа папрацаваць па карэннаму паляпшэнню выхаваўчай работы ў святле патрабаванняў чэрвеньскага (1983 г.) Пленума ЦК КПСС.

Вельмі важна ўзняць на ўзровень свайго навуковага па**тэнцыялу эфектыўнасць выкон**ваемых даследаванняў. Нічым не апраўдана тое, што дзве з чатырох кафедр не вядуць навуковых распрацовак па гаспдагаворах. Трэба дабіцца, каб **кожны выкладчык з вучонай сту**пенню дамагаўся ўкаранення вынікаў даследаванняў па тэмах дысертацый, асабліва ў сувязі з рашэннем Харчовай праграмы СССР.

Абмеркаванне даклада С. Ф. Алешкі праходзіла ў прынцы**повай і дзелавой абстаноўцы.** Заслугоўвае ўвагі работа кафедры фізіялогіі чалавека і жывёлін па прафарыентацыі. Аб гэтым гаварыў яе загадчык дацэнт **А. І. Кіеня.**

Намеснік сакратара парткома па ідэалагічнай рабоце **Г. Д. Ветлугаеў** асвятліў стан палітычнай вучобы на біяфаку. У яе арганізацыі і правядзенні ёсць **нямала павучальнага.**

Загадчык кафедры дыфураўненняў, член парткома **У. І. Міроненка** ў сваім выступленні ахарактарызаваў узровень пастаноўкі на факультэце навуковых даследаванняў і іх эканамічнай эфектыўнасці.

Аб паляпшэнні работы куратараў на факультэце гаварыў старшыня Савета куратараў **ГДУ А. А. Лытко,** а камсамольскай арганізацыі — намеснік сакратара камітэта ЛКСМБ універсітэта **В. І. Шэвелева.**

На сходзе з вялікай увагай было выслухана выступленне па абмяркоўваемаму пытанню рэктара універсітэта акадэміка АН БССР **Б. В. Бокуця.**

На партыйным сходзе прынята пастанова, рэалізацыя якой дазволіць камуністам і ўсяму калектыву біялагічнага факультэта дасягнуць значна вышэйшых **вынікаў па ўсіх** напрамках сваёй дзейнасці.

**Б. ВАЛОДЗІН.**



На здымку: слухачы аддзялення савецкіх традыцый і абрадаў народнага універсітэта маральна-эстэтычнага выхавання, студэнты групы Т-45 завочнага факультэта ў час дыскусіі «Традыцыі працоўных калектываў», якую вяла дацэнт кафедры філасофіі Т. П. Гараніна.

Фота А. Пашкевіча.

# ПРАВА НА СТУДЭНЦКІ БІЛЕТ

Міністэрства вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі СССР зацвердзіла правілы прыёму ў вышэйшыя навучальныя ўстановы на 1984 год. Унесеныя ў іх дапаўненні як паведамілі карэспандэнту ТАСС у Міністэрстве вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі СССР, адлюстроўваюць задачы, якія вынікаюць з асноўных напрамкаў рэформы агульнаадукацыйнай прафесіянальнай школы.

Новыя правілы будуць садзейнічаць паляпшэнню адбору моладзі, якая паступае ў ВНУ, што рыхтуюць выкладчыкаў і майстроў вытворчага навучання. Правам першачарговага залічэння ў педагагічныя інстытуты і на педагагічныя аддзяленні або факультэты ўніверсітэтаў цяпер будуць карыстацца асобы, накіраваныя ў гэтыя ВНУ па рэкамендацыі педсаветаў школ, сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў і прафтэхвучылішчаў, органаў народнай асветы, працоўных калектываў і камітэтаў камсамола.

Факультэты ВНУ, якія рыхтуюць выкладчыкаў для прафтэхвучылішчаў, як правіла, будуць прымаць выпускнікоў сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў і прафесіянальна - тэхнічных вучылішчаў, а таксама рабочую і сельскую моладзь, звольненых у запас ваеннаслужачых, якія маюць вытворчую спецыяльнасць і схільнасць да педагагічнай работы.

Уведзена льгота для настаўнікаў, выхавацеляў і майстроў вытворчага навучання, якія маюць сярэднюю педагагічную адукацыю і стаж педагагічнай работы не менш аднаго года. Па накіраванню органаў народнай і прафесіянальна - тэхнічнай асветы янь будуць прымацца на вучобу без адрыву ад вытворчасці ў ВНУ, якія вядуць падрыхтоўку педагогаў і майстроў вытворчага навучання, не па выніках экзаменаў, а на аснове гутаркі.

У адпаведнасці з новымі правіламі адмяняецца палажэнне аб уліку сярэдняга бала дакумента аб сярэдняй адукацыі пры залічэнні ў ВНУ. З гэтага часу конкурс будзе праводзіцца з улікам адзнак, атрыманых абітурыентамі на ўступных экзаменах.

Як і ў папярэднія гады, асобы, узнагароджаныя пасля заканчэння сярэдняй школы залатым або сярэбраным медалём, а таксама выпускнікі сярэдніх прафесіянальна-тэхнічных і спецыяльных навучальных устаноў, якія маюць дыплом з адзнакай, будуць здаваць толькі адзін экзамен, вызначаны ВНУ. Пры здачы яго з адзнакай «пяць» абітурыент вызваляецца ад далейшай здачы ўступных экзаменаў, а пры атрыманні адзнакі «чатыры» або «тры» здае экзамены па ўсіх дысцыплінах.

На вострадэфіцытныя спецыяльнасці для металургічнай, горна- і нафтаздабываючай прамысловасці, будаўніцтва, транспарту, сельскай гаспадаркі і іншых вядучых галін медалісты і выдатнікі паступаюць без экзаменаў.

Асобы, якія маюць у дакуменце аб сярэдняй адукацыі толькі добрыя і выдатныя адзнакі, трымаюць два экзамены. Абітурыент, які набраў не менш дзевяці балаў, залічваецца ў лік студэнтаў. Гэта ж катэгорыя асоб, якія паступаюць на вострадэфіцытныя спецыяльнасці, будзе вызваляцца ад далейшых экзаменаў, калі пасля здачы двух прадметаў набярэ не менш васьмі балаў.

Новыя правілы нацэльваюць прыёмныя камісіі ўлічваць прафесіянальную падрыхтоўку моладзі, якая заканчвае спецыяльныя і прафесіянальна - тэхнічныя навучальныя ўстановы. Іх выпускнікам, якія атрымалі дыплом з адзнакай або прапрацавалі па спецыяльнасці ўстаноўлены тэрмін, прадстаўлена права пазаконкурснага паступлення ў ВНУ на аднатыпныя спецыяльнасці.



БЛІЗКІЯ СЭРЦУ МЯСЦІНЫ.

Фота С. Коваля.

# ДА ЎВАГІ КУРАТАРАЎ І ПАЛІТІНФАРМАТАРАЎ!

Сярод студэнтаў у чэрвені рэкамендуецца правесці палітычныя інфармацыі і гутаркі на тэмы:

### І. ПЫТАННІ ПАЛІТЫЧНАГА ЖЫЦЦЯ

**1. Азнамянуем подзвіг герояў высокімі дасягненнямі ў працы, вучобе, творчасці!** (Аб патрыятычным імкненні працаўнікоў горада і вёскі паспяхова завяршыць заданні першага паўгоддзя, дастойна сустрэць 40-годдзе вызвалення Савецкай Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў).

Матэрыял публікуе газета «Звязда».

**2. Савецкая моладзь — актыўны будаўнік камунізму** (Да Дня савецкай моладзі — 24 чэрвеня).

Матэрыял публікуюць усе газеты.

**3. Сімвалы нашай дзяржаўнасці: Герб Краіны Саветаў.**

Матэрыял апублікаван у часопісе «Агитатор», № 10 за 1984 г.

### ІІ. ПЫТАННІ ЭКАНАМІЧНАГА ЖЫЦЦЯ

**4. Берагчы метал — «хлеб» індустрыі** (Аб актыўным удзеле рабочых і спецыялістаў прадпрыемстваў у пошуку шляхоў скарачэння расходу металу, ліквідацыі яго страт на вытворчасці).

У аснову палітінфармацый і гутарак пакласці парады і рэкамендацыі, выказаныя Генеральным сакратаром ЦК КПСС, Старшынёй Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР таварышам К. У. Чарненкам на сустрэчы з рабочымі маскоўскага металургічнага завода «Серп і молат» (гл. «Правду» за 30 красавіка г. г.).

### ІІІ. ПЫТАННІ КУЛЬТУРЫ І КАМУНІСТЫЧНАГА ВЫХАВАННЯ

**5. Свет тваіх захапленняў** (Аб няўхільным росце культурных інтарэсаў і запатрабаванняў савецкага чалавека).

Матэрыял публікуе газета «Чырвоная змена».

**6. Выхаванню дзяцей — усеагульныя клопаты** (У гутарцы расказаць аб удзеле працоўнага калектыву ў падрыхтоўцы падрастаючага пакалення да жыцця, да працы).

Матэрыял публікуе газета «Знамя юности».

### ІV. ПЫТАННІ МІЖНАРОДНАГА ЖЫЦЦЯ І ПАЛІТЫЧНАГА ВЫКРЫЦЦЯ ІМПЕРЫЯЛІЗМУ

**7. Ліквідаваць пагрозу мілітарызацыі космасу** (Аб імкненні Савецкага Саюза не дапусціць ажыццяўлення зласлівых планаў амерыканскага імперыялізму перанесці гонку ўзбраенняў у космас, ператварыць яго ў плацдарм агрэсіі, вайны).

У аснову палітінфармацый і гутарак пакласці ацэнкі і вывады, змешчаныя ў адказе К. У. Чарненкі на зварот амерыканскіх вучоных («Правда», 20 мая г. г.). Гл. таксама артыкулы ў часопісе «Международная жизнь», № 5 за 1984 г., газеце «Труд» (23 мая г. г.).

**8. Капіталізм без прыкрас: украдзенае дзяцінства** (Аб становішчы дзяцей працоўных у капіталістычных краінах).

Матэрыял апублікаван у часопісе «Политинформатор и агитатор», № 8 за 1984 г.

Спорт

# ЧЭМПІЁНКІ!

Жаночая каманда універсітэта па ручному мячу ў апошнія гады радуе сваіх балельшчыкай стабільнымі выступленнямі. Новага поспеху яна дасягнула ў розыгрышы першынства Белсавета СДСТ «Буравеснік», які праходзіў з 24 па 30 мая ў гарадскім спорткомплексе Гомеля. У фінальных гульнях званне чэмпіёнак аспрэчвалі гандбалісткі Брэсцкіх педагагічнага і інжынерна-будаўнічага, Віцебскага тэхналагічнага, Беларускіх політэхнічнага і тэхналагічнага інстытутаў і ГДУ. Нашы студэнткі прадэманстравалі высокі клас і ўсіх сапернiц перамаглі з яўнай перавагай. Так, у другога прызёра- — гандбалістак Брэсцкага падінстытута — яны выйгралі з лікам 33:22, у трэцяга — каманды БПІ — 28:7. Як кажуць, «на галаву вышэй» каманда ГДУ была і за астатніх сваіх сапернiц. Яна стала чэмпіёнам студэнцкага таварыства рэспублікі. Назаву прозвішчы чэмпіёнак. Гэта І. Навіцкая, Т. Карнарук, А. Варакса, Т. Клязовіч з факультэта фізвыхавання, Л. Данькова, Т. Шаўло, Н. Старавойт, А. Хартановіч, А. Дзігілева з эканомфака і Л. Дзідзенка з біяфака. Яны, а таксама Т. Альхоўская з факультэта фізвыхавання ўключаны кандыдатамі ў зборную студэнцкую каманду рэспублікі для ўдзелу ва Усесаюзных летніх спартыўных гульнях. Дарэчы, занальныя і фінальныя спаборніцтвы жаночых каманд па ручному мячу прадстаячых гульняў адбудуцца ў Гомелі.

В. КРУКОЎСКІ,
старшы выкладчык, трэнер каманды.



Радасць перамогі. Жаночая каманда ГДУ па ручному мячу са сваім трэнерам В. Крукоўскім.

Фота А. Пашкевіча.



На стадыёне універсітэта адбыліся спаборніцтвы санітарных дружын і санпастоў ГДУ. У іх прынялі ўдзел шэсць санітарных дружын і чатыры санпасты.

Лепшыя веды па аказанню першай медыцынскай дапамогі паказалі сандружына матэматычнага факультэта і санпост АГЧ. Яны занялі першае месца і атрымалі права ўдзельнічаць у раённых спаборніцтвах. На іх сандружына універсітэта на ўсіх этапах спаборніцтва таксама прадэманстравала добрыя веды па медыцынскай падрыхтоўцы. Яна ўзнагароджана Ганаровай граматай.

Санітарны пост увайшоў у пяцёрку лепшых санпастоў Цэнтральнага раёна г. Гомеля.

І. СЯРОГАЎ,
старшыня камітэта таварыства Чырвонага Крыжа ГДУ.

На здымку: санпост АГЧ рыхтуецца да спаборніцтваў.

Фота А. Пашкевіча.

# ГОСЦІ — УКРАІНСКІЯ АРТЫСТЫ

У г. Гомелі праходзяць гастролі Данецкага ордэна «Знак Пашаны» абласнога рускага драматычнага тэатра. У яго рэпертуары — спектаклі, пастаўленыя па творах класікаў замежнай літаратуры, сучасных аўтараў.

Учора 150 студэнтаў і супрацоўнікаў нашага універсітэта ўбачылі на сцэне аблдрамтэатра трагедыю «Кароль Лір» па п'есе У. Шэкспіра. На працягу чэрвеня члены універсітэцкага калектыву змогуць пазнаёміцца з творчасцю ўкраінскіх артыстаў па камедыі А. Крыма «Фіктыўны шлюб», а таксама па спектаклях «Любоў і галубы», «Дама-невідзімка», «Любоў у Стара-Каротkіна».

Білеты можна купіць у прафкоме студэнтаў.

Рэдактар Ул. БАЛОГА.

«Гомельский университет» — орган парткома, ректората, комитета ЛКСМБ и профкомов Гомельского государственного университета (на белорусском языке), Гомельская фабрыка «Палесдрук» Дзяржкамітэта БССР па справах выдавецтваў, паліграфіі і кніжнага гандлю. Гомель, Савецкая, 1. Аб'ём — 1 друк аркуш. Тыраж 2000 экз.
Наш адрас: вул. Савецкая, 104, п. 3-11, т. 57-16-52.
АЗ 11077
Заказ 1998